# Чалавек і кніга: насустрач адно аднаму



**«Культурная пятніца ў музеі» – гэта праект Гомельскага гісторыка-краязнаўчага музея, у якім плануецца ахапіць самыя розныя сферы культурнай і навуковай спадчыны, расказаць аб цікавых і знакамітых земляках.**

Па задуме арганізатараў цыклу мера-прыемстваў, кожная сустрэча будзе прымеркавана да важнай даты або падзеі. Вось і напярэдадні Дня ведаў прайшла "культурная пятніца", прысвечаная галоўнай крыніцы асветы – Кнізе. Дадатковай нагодай выбраць менавіта гэтую тэматыку стала выстава мініяцюрных кніг Міхаіла Ксеневіча, якая зараз экспануецца ў музеі.

*– Заснавальнікам калекцыі, якая налічвае 352 мініяцюрныя кнігі, быў Яўген Ксяневіч – творчы чалавек, знаўца мас-тацтва і вялікі энтузіяст. Справу яго працягвае сын Міхаіл, –*

зазначыла дырэктар музея Кацярына Варабей. – *Вялікая ўдача, што ў нашых наведвальнікаў з’явілася магчымасць азнаёміцца з гэтым унікальным зборам міні-кніг, якія выстаўляюцца даволі рэдка…*

Сапраўды, мініяцюрныя кнігі – гэта своеасаблівыя творы мастацтва, якія заў-сёды выдаюцца абмежаванымі тыражамі. А ў калекцыі Ксяневіча кожнае выданне – са сваёй гісторыяй: ёсць зборнік вершаў, які браў з сабой у палёт беларускі касманаўт Пётр Клімук, унікальны міні-двухтомнік Коласа і Купалы, кнігі з аўтографамі знакамітых аўтараў. Дарэчы, вокладка кніжкі найменшага фармату мае толькі 5 сантыметраў у вышыню і 4 – у шырыню!

Не менш цікавымі былі і іншыя тэматычныя экспазіцыі – выстава рарытэтных кніг і выданняў, якія былі падараваны музею, фотадакументаў аб жыцці і творчасці нашага знакамітага земляка – пісьменніка Івана Кірэевіча Сяркова.

Дарэчы, хоць на “культурную пятніцу” сабраліся аматары кніг самага рознага ўзросту – ад дашкольнікаў да чытачоў са шматгадовым стажам – практычна ўсе яны прызналіся, што з’яўляюцца прыхільнікамі трылогіі “Мы з Санькам…”, напісанай І. Сярковым. Вельмі сімвалічным было тое, што яны прынялі ўдзел у эстафеце “чытання ўголас”, успомнілі мясціны родных Пакалюбіч, аб якіх ішла размова ў вядомых творах.

Таксама ўсе ўдзельнікі сустрэчы ўк-лючыліся ў зацікаўленае абмеркаванне ролі літаратуры ў сучасным грамадстве, падзяліліся сакрэтамі прывіцця любові да чытання падчас “круглага стала” “Чалавек і кніга: насустрач адно аднаму”.

*– Калі я быў маленькі, мама кожны вечар чытала мне па 2–3 старонкі новай кніжкі. Потым навучыўся чытаць самастойна і мастацкая літаратура стала часткай майго жыцця!* – расказаў сямікласнік Арсеній Макаранка, які некалькі раз прызнаваўся ў Пакалюбіцкай сярэдняй школе лепшым чытачом года.

Мама самай маленькай чытачкі Вікторыі Хмелянок – Таццяна

Валер’еўна – падзялілася, што яны з дачкой не толькі чытаюць, але і самі “пішуць” кнігі. Дзяўчынка робіць малюнкі, а маці выдумляе да іх цікавыя гісторыі.
Дарэчы, калі самай юнай чытачцы Пакалюбіцкай сельскай бібліятэкі толькі пяць гадоў, то самаму сталаму чытачу – ўжо 101. Гэта наш вядомы доўгажыхар, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Іван Дзмітрыевіч Кондрусеў…

Шмат цёплых слоў прагучала ў гэты дзень у адрас кніг, якія на працягу многіх стагоддзяў выхоўваюць у чалавеку самае лепшае. Усе ўдзельнікі сустрэчы атрымалі запрашэнне наведаць і наступную “культурную пятніцу ў музеі”, якая абяцае быць не менш насычанай і цікавай.






http://sozhnews.by